№ 1 1/2 номера

ДА 300-ГОДДЗЯ ЎЗ'ЯДНАННЯ УКРАІНЫ З РАСІЯЙ

У вечнай і непарушнай дружбе

□

Аляксей КУЛАКОЎСКІ

□

Прайшло тры стагоддзі з часу ўз'яднання двух вялікіх народаў — украінскага і рускага. Тры стагоддзі таму назад адбылося слаўнае ў вяках рашэнне Пераяслаўскай Рады. Але і да гэтага вялікі украінскі народ імкнуўся да яднання і дружбы з вялікім рускім народам, бо ён вышаў з адзінага кораня старажытна-рускай народнасці, звязаны з рускім народам адзінствам паходжання, блізкасцю і агульнасцю ўсяго гістарычнага развіцця.

Уз'яднанне надало сілы украінскаму народу, абараніла яго ад заняволення. Два вялікія народы, два шчырыя браты, узяўшыся за рукі, адчулі, што яны мацней стаяць на зямлі, што ў такой дружбе іх нічтэй жыць, лягчэй пераадольваць любыя выпрабаванні.

Уз'яднаўшыся з рускім народам, украінскі народ праз пэўны час стаў яшчэ больш блізкім і родным беларускаму народу, якім яго яднала адзінства паходжання і бясспрэчная блізкасць гістарычнага развіцця. Уз'яднанне украінцаў з рускімі садзейнічала вызваленню беларускага народа з-пад прыгнёту польскіх паноў. Такім чынам, побач з двума слаўнымі братамі стаў трэці брат, яшчэ больш стала ў гэтай сілы, яшчэ ясней стала мэта жыцця.

І пайшлі тры браты насустрач усялякім нягодам і выпрабаванням. Нішто ім не было страшным. У кожнага за спіной быў малы вопыт змагання за свабоду, за шчасце. У кожнага былі свае нацыянальныя героі, перадавыя людзі, якім можна было даверыцца, за якімі можна ісці.

Вызваленчая вайна украінскага народа 1648—1654 гадоў праходзіла пад кіраўніцтвам Багдана Хмяльніцкага. У гэты перыяд на Украіне з'явіліся такія легендарныя героі, як Максім Крыванос, Нечай, Багун, Небаба. У Беларусі праславілі сябе неўміручымі подзвігамі Гарэуша, Галота, якія ўзначалілі ў той час барацьбу беларускага народа супраць польскай шляхты. І калі даводзілася зноў уступаць у вызваленчую барацьбу, незабыўныя патрыятычныя подзвігі гэтых герояў служылі лепшым прыкладам, натхнялі людзей на барацьбу, усялялі ў іх душы ўпэўненасць у перамогу.

Так былі пройдзены вялікія гістарычныя шляхі. У Айчынную вайну 1812 года тры браты ў стальным баявым саюзе пастомна змаганіся з іншаземнымі інтэрвентамі. Незабыўныя традыцыі рускага, украінскага, беларускага народаў, набытыя ў вызваленчай вайне супраць іншаземнага прыгнёту, супраць абшарнікаў сваіх краін, адыгралі тут немалую ролю. З'явіліся новыя нацыянальныя героі, і ў асноўных сваіх рысах яны былі падобнымі на Багдана Хмяльніцкага, на Максіма Крыванова, на Нечая, Багуна, Гаркушу, Галоту.

Для далейшага развіцця рускага, украінскага, беларускага і іншых народаў Расіі мела рашаючае значэнне з'яўленне на гістарычнай арэне самага рэвалюцыйнага ў свеце расійскага пролетарыята і яго баявога авангарда — Комуністычнай партыі.

У Вялікай Кастрычніцкай соцыялістычнай рэвалюцыі, у агні грамадзянскай вайны, у гістарычных бітвах Вялікай Айчыннай вайны мацнелі і загартоўваліся саюз і непарушная дружба рускага і украінскага народаў.

У гэтым саюзе цвёрдым, упэўненым крокам ішоў і беларускі народ. Колькі можна было-б прывесці яскравых прыкладаў для пацверджання сказанага!

Мне даводзілася знаёміцца з многімі дакументамі аб партызанскім руху на Украіне і ў Беларусі. І заўсёды мяне, — вядома, не толькі мяне, — глыбока захапляілі і хвалявалі факты брацкага саюза народаў СССР у гэтай барацьбе супраць фашысцкіх акупантаў. Украінскія партызаны заўсёды аказвалі самую дзейсную дапамогу беларускім партызанам, а беларускія — украінскім. Тысячы украінцаў ваявалі на беларускай зямлі побач з беларусамі, тысячы беларусаў ваявалі на украінскай зямлі побач з украінцамі. Украінскія героі партызанскай вайны, якія праславілі сябе гераічнымі подзвігамі, былі шырока вядомымі і любімымі на Беларусі, а нашы беларускія героі шанаваліся украінцамі.

Выдатная гістарычная падзея — 300-годдзе ўз'яднання Украіны з Расіяй — вялікае нацыянальнае свята. Разам з вялікім рускім народам, разам з украінскім народам, з усімі братнімі народамі Совецкага Саюза будзе ўрачыста і радасна адзначаць гэтую важную падзею і ўвесь беларускі народ. Мы будзем святкаваць, шчыра жадаючы шчасця і далейшага росквіту украінскаму народу, шчыра жадаючы яшчэ большага ўмацавання дружбы народаў Совецкага Саюза.

Яднанне культур, яднанне сэрцаў

★

Сцяпан КРЫЖАНІЎСКІ

★

Яднанне прадстаўнікоў совецкіх культур розных нацыянальнасцей стала шчасліваю традыцыяй совецкай эпохі. Гэтае яднанне адлюстроўвае перамогу ідэалогіі дружбы народаў, што зрабілася законам нашага жыцця.

Мацнеюць сувязі, сімпатыі, дружба, брацкасць прадстаўнікоў рускай, украінскай, беларускай культуры, таксама, як мацнеюць сувязі культур усіх совецкіх народаў.

Яшчэ ў першыя дзесяцігоддзі совецкай эпохі пераклады твораў беларускіх паэтаў пачалі з'яўляцца ва украінскіх газетах і часопісах. Асабліва пашырылася абмена літаратур пасля таго, як украінскіх пісьменнікі наведалі Мінск улетку 1929 года. Пачаўся актыўны абмен кнігамі, часопісамі, новымі творамі, з'явіліся пераклады украінскіх паэтаў, прысвечаныя жыццю і працы рускі, а таксама вершы беларускіх паэтаў, прысвечаныя Украіне.

Летку 1929 года вялікая група беларускіх пісьменнікаў прыязджала на Украіну, у тагачасную сталіцу яе — Харкава вялікія групы беларускіх і украінскіх пісьменнікаў ездзілі ў Кіеў, а адтуль — зрабілі падарожжа па Дняпры.

Забыць і таго, што ўжо да дзесяцігоддзя совецкай улады на Украіне выйшаў пераклад паэмы Паўлюка «Сцяты падмурак». Усё часцей і часцей з'яўляліся на украінскай мове творы Купалы, Якуба Коласа, а ў 1927 годзе была надрукавана асобная кніга Янкі Купалы «Над рахою».

Асабліва, 1937 годзе вышла перакладзе «Выбраных твораў» Янкі Купалы, пераклады якіх былі зроблены лучшымі паэтамі. Я памятаю, з якой захапленнем працавалі мы, тады украінскія паэты, над гэтымі перакладамі, як глыбока западалі нам у душу, меладычныя, па-народнаму багатыя вершы і песень. Агульнага з украінскай народнай знаходзілі мы ў яго творах, таксама беларускай народнай творчасці Янка Купала і Якуб Колас, як і Шэўчэнка, падслухалі свае песні ў самога народа.

Гэтая шчырая дружба і шчырае яднанне мацнелі з кожным годам.

У даваенныя гады было праведзена некалькі вялікіх юбілеяў брацкіх культур, якія сталі сапраўдным культурным святам усяго совецкага народа. Гэта былі юбілеі «Слова аб палку Ігаравым» і Пушкіна, юбілей геніяльнай грузінскай паэмы «Віцязь у тыгравай шкуры» Шота Руставелі ў 1937 годзе, юбілей Тараса Шэўчэнкі ў 1939 годзе, юбілей Коста Хетагурава, армянскага народнага эпаса «Давід Сасунскі», а перад самай вайной — юбілеі нашых лепшых паэтаў Паўла Тычыны, Янкі Купалы. Усе гэтыя святы спрыялі яднанню і арабістай дружбе мастакоў слова, дэталёваму азнаямленню з жыццём, бытам, культурай, літаратурай брацкіх рэспублік.

Хіба можна забыць юбілей Шэўчэнкі ў 1939 годзе калі над магілай незабыўнага Кабзара лепшыя песняры совецкіх народаў на шанаццаці мовах чыталі яго «Запавет». Ды чытаў свой пераклад «Запавета» і Янка Купала. Тады-ж выйшаў у перакладзе на беларускую мову шэўчэнкаўскі «Кабзар».

Брацкія сувязі яшчэ больш узмацніліся ў час Вялікай Айчыннай вайны. Рускі, украінскі, беларускі — усе народы Совецкага Саюза абаранялі сваю Айчыну, а іх песняры дапамагалі сваім мастацкім словам справе перамогі над ворагам.

А якімі могутнымі крокамі пайшло яднанне культур і сэрцаў украінскага і беларускага народаў у пасляваенны час! Нашы сустрэчы і размовы, агульныя намаганні ва ўзаемаўзбагачэнні нашых соцыялістычных культур далі выдатныя багатыя вынікі.

Можна пісаць летапіс гэтай дружбы, і ў гэтым летапісі стаялі-б такія выдатныя факты. У пасляваенны час у выдавецтвах Украіны выйшлі выбраныя творы Янкі Купалы, Якуба Коласа, Аркадзя Куляшова, Янкі Брыля. У Беларусі выйшлі творы Аляксандра Карнейчука, Паўла Тычыны, Максіма Рыльскага.

У 1948 годзе вышла на украінскай мове Анталогія беларускай совецкай паэзіі.

У 1952 годзе вышла на беларускай мове Анталогія украінскай совецкай паэзіі.

Украінскія совецкія пісьменнікі многа разоў наведвалі Беларусь; не менш жаданымі гасцямі былі і беларусы ў сталіцы Украіны — Кіеве.

Асабліва памятны прыезд беларускіх пісьменнікаў у мінулым годзе, калі на схілах Дняпра, у Зялёным тэатры, яны выступалі перад тысячнаю аўдыторыяй моладзі сталіцы.

Дружба, яднанне брацкіх народаў і культур павінны расці і расці, набываць новыя маштабы. Нам хацелася-б, каб з'явіліся новыя творы, у якіх дружба ўсіх совецкіх народаў, у тым ліку украінскага і рускага, адлюстроўвалася-б не дэкларацыйна і не парадна, а ў самай сваёй найглыбейшай і яскравай сутнасці. А для гэтага трэба, каб нашы пісьменнікі і прадстаўнікі навукі глыбей вывучалі жыццё нашых брацкіх народаў, глыбінныя працэсы іх гаспадаркі і культуры і каб напісалі новыя творы: беларусы — пра украінцаў, украінцы—пра беларусаў.

Хацелася-б, каб на паліцах нашых бібліятэк да новых і найбольш поўных выданняў твораў Янкі Купалы, Якуба Коласа, Аляксандра Карнейчука, Паўла Тычыны далучыліся выданні твораў многіх нашых цудоўных мастакоў слова — паэтаў, празаікаў, драматургаў, якія ўзбагацілі сваю нацыянальную культуру і тым самым узбагачваюць інтэрнацыянальную культуру ўсіх народаў Совецкага Саюза.

Хацелася-б, каб мы яшчэ часцей сустракаліся, яшчэ ўважлівей чыталі творы адзін другога і каб услаўлялі новыя дасягненні і подзвігі нашых народаў-творцаў, якія будуюць комунізм.

Няхай жыве наша вялікая, сонечная дружба, асветленая сцягам Комуністычнай партыі, сцягам вялікіх тварцоў і натхняльнікаў нашай дружбы Леніна і Сталіна.

НАВЕКІ РАЗАМ, НАВЕКІ З РУСКІМ НАРОДАМ.

Фрагмент карціны украінскага мастака М. Хмялько.

Шосты пленум Саюза совецкіх пісьменнікаў БССР

Два дні — 28 і 29 снежня — праходзіў шосты пленум Саюза совецкіх пісьменнікаў БССР.

Адкрываючы пленум, старшыня ССП БССР **П. Броўка** звярнуўся да яго ўдзельнікаў з кароткай прамовай.

— Чатырнаццаты пленум ССП СССР разгледзеў важныя пытанні совецкай драматургіі, ускрыў галоўныя недахопы яе развіцця, вызначыў задачы, што стаяць у сучасны момант перад совецкімі драматургамі. Наш пленум закліканы на аснове вывучэння матэрыялаў чатырнаццатага пленума ССП СССР вызначыць далейшы шлях росту беларускай совецкай драматургіі.

Рашэнні вераснёўскага Пленума Цэнтральнага Камітэта КПСС паставілі вялікія і пачэсныя задачы перад нашай літаратурай, у тым ліку і драматычнай. Нам патрэбны такія творы аб нашым жыцці, якія маглі-б выйсці на ўсесаюзную сцэну.

З дакладам аб выніках XIV пленума ССП СССР і задачах беларускай совецкай драматургіі выступіў **А. Макаёнак.**

— Той факт, — гаворыць дакладчык, — што многія тэатры, паказаўшы некалькі спектакляў па некаторых п'есах, спраўляюць на іх хаўтуры, прымушае задумацца над прадукцыяй, што выходзіць з-пад пяра драматургаў.

Дакладчык прыводзіць рад лічбаў, якія ілюструюць сцэнічнае жыццё некаторых п'ес і цікавасць да іх гледачоў.

Большасць нашых п'ес, гаворыць ён, не карыстаецца прыхільнасцю, любоўю, павагай гледача. Прычына, на думку дакладчыка, у тым, што нашы драматургі ў большасці не валодаюць дастатковым майстэрствам, не глыбока асэнсоўваюць жыццё, не ўзнімаюць важных праблем, не ствараюць жывых характараў.

Дакладчык спыняецца далей на істотных недахопах беларускай драматургіі.

Разглядаючы п'есы аб людзях калгаснай вёскі, А. Макаёнак гаворыць, што ў іх не адчувалася пульсу барацьбы, дыхання жыцця, героі п'ес часта не дзейнічаюць, а размаўляюць, у п'есах няма канфліктных абставін, у якіх можа выявіцца характар. Барацьба, канфлікты, дзеянне адбываюцца і вырашаюцца недзе па-за сцэнай, а гледачу падаецца толькі вынік.

Ці не хопіць ужо ківаць на «тэорыю» бесканфліктнасці, апраўдваючы сваю дзіцячую несамастойнасць у ацэнцы жыццёвых з'яў? Ці не варта спытаць, а дзе пісьменніцкае сумленне перад праўдай жыцця? І якая справа гледачу да таго, што нехта выдумаў антымарксісцкую шкодную тэорыю, а пісьменнік паслухмяна [illegible]ае гэтай тэорыі.

Адзіная ўдалая п'еса на тэму калгаснага жыцця — «Пяюць жаваранкі» К. Крапіва і — не можа засланіць нашы вялікія промахі ў гэтай галіне.

Далей дакладчык спыняецца на перспектывах папаўнення рэпертуара тэатраў новымі п'есамі ў будучым годзе.

Коратка ахарактарызаваўшы некаторыя новыя п'есы, над якімі працуюць зараз тэатры, дакладчык указвае, што адной з магчымасцей папаўнення рэпертуара з'яўляецца аднаўленне п'ес, якія незаслужана забыты.

Спыніўшыся на пытанні сувязі драматургаў з тэатрамі, А. Макаёнак гаворыць, што некаторыя тэатры яшчэ з пагардай і недавер'ем адносяцца да маладых драматургаў. Асабліва гэта датычыць тэатра імя Янкі Купалы. Па-сапраўднаму творча працуе з драматургамі Віцебскі тэатр імя Якуба Коласа. Варта было-б перанесці гэты вопыт у іншыя тэатры.

Недаравальна мала працуюць нашы драматургі над аднаактнай п'есай для шматлікіх калектываў самадзейнасці.

У заключэнне дакладчык спыняецца на стане мастацкай крытыкі. У нас яшчэ не распрацавана тэорыя драмы, пытанні гісторыі беларускай драматургіі. Многа ў крытыцы суб'ектывізма. Рэцэнзенты часта пішуць без належнага ведання прадмета і гэтым дэзарыентуюць і тэатр і драматурга.

У сваім выступленні **В. Вольскі** гаварыў аб неабходнасці стварэння ў рэспубліцы тэатра юнага гледача. Для дзяцей драматургі пішуць недаравальна рэдка. Мала ставяць дзіцячых п'ес нашы тэатры.

Прамоўца таксама спыняецца на пытанні сувязі тэатра і драматурга. Нашы тэатры нярэдка з баязлівасцю падыходзяць да новай п'есы, імкнуцца адсунуць ад сябе адказнасць у арганізацыі рэпертуара, набыць гарантыі ад вышэйстаячых інстанцый.

Ул. Няфёд прааналізаваў вытокі так званай «тэорыі» бесканфліктнасці, рэцыдывы якой яшчэ і зараз ёсць у літаратуразнаўстве.

Аб рабоце Рускага драматычнага тэатра БССР у 1953 годзе, аб планах 1954 года гаварыў галоўны рэжысёр тэатра **В Фёдараў.**

Ён адзначыў мастацкую слабасць многіх п'ес, адсутнасць работы драматурга над мовай. Дрэнная мова п'ес — вялікае зло, з якім трэба змагацца.

У нас няправільна разумеюць сувязь драматурга з тэатрам, гаворыць Фёдараў. Гісторыя рускага тэатра ведае нямала прыкладаў, калі драматург вызначае лінію тэатра. А цяпер некаторыя драматургі прыходзяць у тэатр, як школьнікі. Ёсць адзін шлях — прыносіць у тэатр поўнацэнны мастацкі твор. Прамоўца робіць рад слушных заўваг аб крытыцы, якая часам не толькі не дапамагае развіццю драматургіі і тэатра, а перашкаджае.

Загадчык драматычнага аддзела рэспубліканскага Дома народнай творчасці **К. Стэцкі** заклікаў пісьменнікаў ствараць аднаактныя п'есы для нашай самадзейнасці.

Затым выступіў крытык **В. Піменаў** (Масква), які гаварыў аб слабым драматургічным майстэрстве многіх п'ес, аб недастатковым пранікненні беларускіх драматургаў ва ўнутраны свет герояў, аб адсутнасці ў п'есах добрай займальнасці.

Першым на паседжанні 29 снежня выступіў дырэктар Віцебскага тэатра імя Якуба Коласа **І. Дорскі.**

— Адзіная новая п'еса ў 1953 г.,—гаворыць ён, — гэта п'еса А. Макаёнка «Выбачайце, калі ласка!». Нельга спасылацца на «тэорыю» бесканфліктнасці, апраўдваючы такое становішча. Прычына тут тая, што для многіх нават вядучых драматургаў стварэнне п'ес не стала яшчэ справай жыцця. Неахвотна прыходзяць у драматургію пісьменнікі з другіх жанраў. Але галоўнае тое, што драматургі дрэнна ведаюць жыццё. Часам веданне жыцця падмяняецца трыманнем «носа па ветру».

Гаворачы аб сувязі драматурга і тэатра, І. Дорскі зазначыў, што няправільна думаюць тыя, хто лічыць, што тэатр можа браць толькі гатовыя п'есы.

Пытанням беларускай кінадраматургіі прысвяціў сваё выступленне **М. Блісцінаў.** Ён адзначыў, што беларускія пісьменнікі вельмі мала працуюць у галіне кінадраматургіі. Толькі ў самы апошні час намячаецца некаторы зрух.

На трыбуне **К. Крапіва.**

— Працуючы больш 20 год у драматургіі, — сказаў ён, — я і сёння яшчэ не магу павучаць маладых, бо сам раблю промахі. Аб прычыне гэтых промахаў і трэба сёння гаварыць.

Мы ведаем законы драматургіі, але не заўсёды можам прымяняць іх на практыцы. Драматургі часам не могуць канкрэтна рэалізаваць гэтыя законы. Канкрэтнай павінна быць ідэя твора, вобразы людзей, канфлікты. Нездольныя забяспечыць гэтую канкрэтнасць драматургі парушаюць і законы драматургіі. Мала распрацавана пытанне канфлікта ў п'есе.

Прамоўца выказвае некалькі меркаванняў тэарэтычнага парадку і робіць рад заўваг па творах беларускай драматургіі.

У сваім выступленні **М. Клімковіч** гаворыць аб адсутнасці вострых арыгінальных канфліктаў у многіх творах беларускай драматургіі. Ён падвяргае рэзкай крытыцы практыку Тэатра оперы і балета, які механічна «паднаўляе» лібрэта, як гэта было з балетам «Князь-возера». Ён адзначае таксама, што тэатры забыліся на гістарычную тэматыку. М. Клімковіч гаворыць аб новых задачах, новых тэмах, над якімі павінны працаваць драматургі цяпер, пасля рашэнняў вераснёўскага Пленума ЦК КПСС.

Аб адсутнасці глыбокай праблемнасці ў творах многіх драматургаў, пра абмежаванасць тэматыкі беларускай драматургіі гаварыў рэжысёр Віцебскага тэатра імя Якуба Коласа **А. Скібнеўскі.**

Слова прадастаўляецца міністру культуры БССР **Г. Кісялёву.** Ён адзначае пэўныя поспехі ў развіцці беларускай драматургіі і тэатральнага мастацтва. Але гэта не можа засланіць буйных недахопаў. Да гэтага часу не ва ўсіх абласных цэнтрах рэспублікі ёсць свае тэатры. Не задавальняе і творчы рост існуючых тэатральных калектываў, не задавальняе гледача і рэпертуар тэатра. Народ чакае ад драматургаў высокамастацкіх твораў, што ўзнімаюць жыццёва важныя праблемы.

Трэба больш выкарыстоўваць і нашу драматургічную спадчыну і ў першую чаргу творы Я. Купалы і Я. Коласа. Неабходна пераадольваць асаблівыя клопаты па ўмацаванню творчых сувязей паміж тэатрамі і драматургамі. Але нельга згадзіцца з тым, каб тэатр браў недапрацаваныя п'есы. Прамоўца гаворыць, што Міністэрства культуры БССР улічыць крытычныя заўвагі, што былі зроблены ў яго адрас.

Б. Чырскоў (Ленінград) у сваёй прамове сказаў, што драматургія ў асноўнай сваёй масе ўсё яшчэ адстае ад іншых жанраў літаратуры. Ствараць драматургічныя творы могуць і павінны не толькі тыя пісьменнікі, што працуюць выключна ў гэтым жанры. Важна ствараць такія п'есы, на якіх магла-б вучыцца літаратурная моладзь. Крытыка наша звычайна праходзіць міма надрукаваных п'ес, і п'еса, пакуль не ўбачыць сцэны, як быццам знаходзіцца па-за літаратурай.

Старшыня паседжання **К. Крапіва** паведамляе аб смерці выдатнага польскага паэта Юліяна Тувіма. Прысутныя ўшаноўваюць памяць паэта ўставаннем.

Слова бярэ загадчык аддзела навукі і культуры ЦК КПБ **К. Буслаў.** Нават на пленуме, сказаў ён, адчуваецца нейкая самазаспакоенасць драматургаў. У дакладзе мала было аналізу, у ім гаварылася галоўным чынам аб п'есах, напісаных да XIX з'езда КПСС, да вераснёўскага Пленума ЦК КПСС.

Нашы драматургі яшчэ не выканалі тых задач, што пастаўлены Цэнтральным Камітэтам Комуністычнай партыі Беларусі. П'есы аб рабочым класе не могуць нас задаволіць, бо яны не вырашаюць жыццёвых праблем. Па-новаму пасля вераснёўскага Пленума ЦК КПСС трэба вырашаць і тэму калгаснага сяла. Беларускія драматургі пакуль што на гэтую тэму напісалі вельмі мала.

У спрэчках па дакладу выступілі таксама **К. Губарэвіч, А. Есакоў, Я. Рамановіч, М. Садковіч** і інш.

У заключэнне работы пленума выступіў першы сакратар праўлення ССП СССР **А. Суркоў.** Ён гаварыў аб задачах пісьменнікаў, што вынікаюць з росту культуры совецкага грамадства, з апошніх рашэнняў нашай партыі. Гаворачы аб сатыры, прамоўца адзначыў, што замест вывучэння жыцця мы часта вядзем схаластычныя спрэчкі. Сатыра павінна быць заснавана не толькі на пачуцці абурэння супраць перажыткаў мінулага, але і на ўпэўненасці ў нашай справе. Пісьменнікам трэба глыбока авалодаць тэорыяй марксізма-ленінізма, бо без гэтага нельга правільна разумець жыццёвыя з'явы.

З часу першага Усесаюзнага з'езда пісьменнікаў СССР у літаратурным жыцці многае змянілася. Адным з важнейшых вынікаў гэтага перыяду з'яўляецца вялікі рост нацыянальных літаратур. Прамоўца спыняецца на развіцці беларускай совецкай літаратуры, якая вышла на ўсесаюзную арэну. Гаворачы аб вялікіх дасягненнях усёй совецкай літаратуры, А. Суркоў адзначыў, што абавязак нашай літаратуры перад народам перавышае гэтыя дасягненні. Пісьменнікі нярэдка адрываюцца ад жыцця, не звязаны непасрэдна ў паўсядзённай практыцы з героямі сваіх твораў. Многія творы напісаны аб вытворчых працэсах, а не аб людзях. Нехапае нам заклапочанасці аб росце літаратурных кадраў, аб выхаванні пісьменніцкай змены, горкаўскіх клопатаў аб заўтрашнім дні нашай літаратуры.

Такія пытанні належыць вырашыць 2-му Усесаюзнаму з'езду пісьменнікаў.

У рабоце пленума прынялі ўдзел сакратар ЦК КПБ **Ц. Гарбуноў,** прадстаўнікі Саюза совецкіх пісьменнікаў СССР **М. Ісакоўскі, Я. Мазалькоў.**

Мастацкія выстаўкі 1954 года

(Гутарка са старшынёй Саюза совецкіх мастакоў БССР А. Бембелем)

Праўленне Саюза совецкіх мастакоў БССР намеціла арганізаваць у 1954 годзе некалькі групавых і індывідуальных выставак выяўленчага мастацтва.

У лютым наладжваецца выстаўка твораў жывапісу і пейзажаў В. Цвіркі, а ў маі — работ народнага мастака БССР І. Ахрэмчыка. Да экспанавання рыхтуюцца лепшыя кампазіцыі, партрэты, якія напісаны мастакамі ў пасляваенны час.

Асабліва цікавымі павінны быць экспазіцыі эскізаў тэатральных дэкарацый і касцюмаў — работы народнага мастака БССР С. Нікалаева, О. Марыкса, а таксама пейзажаў старэйшага майстра гэтага жанра В. Кудрэвіча.

У новым годзе ўпершыню ў Мінску будуць арганізаваны выстаўкі жывапісцаў, якія жывуць у абласцях рэспублікі: К. Максімцава (Баранавічы) І. Пушкова (Гродна), групавая выстаўка работ мастакоў Брэста, выстаўка палотнаў таленавітай моладзі.

Асаблівае значэнне ў нашай творчасці маюць жанры сатыры і мастацкага плаката. Ім прысвячаюцца асобныя экспазіцыі.

1954 год будзе знамянальным у жыцці беларускіх мастакоў тым, што ўвосень мяркуецца адкрыць рэспубліканскую выстаўку, прысвечаную гадавіне з дня гістарычных пастаноў ЦК КПСС па пытаннях сельскай гаспадаркі. І таму ў новым годзе людзі калгаснай вёскі, іх праца і жыццё будуць у цэнтры ўвагі ўсіх жывапісцаў, скульптараў і графікаў.

З асаблівай энергіяй нашы мастакі павінны рыхтавацца да Усесаюзнай выстаўкі выяўленчага мастацтва (лістапад 1954 г.), якая з'явіцца і нашай творчай справаздачай.

Беларускія мастакі прымуць актыўны ўдзел у творчай канферэнцыі саюзаў совецкіх мастакоў Украіны, Беларусі і Малдавіі, якая склікаецца ў Кіеве.

Для азнаямлення калгаснікаў і сельскай інтэлігенцыі з лепшымі творамі беларускіх мастакоў праўленне Саюза разам з Дзяржаўнай карціннай галерэяй БССР арганізуе тры перасоўныя выстаўкі. Іх экспанаты будуць паказаны ў раённых і сельскіх дамах культуры, хатах-чытальнях.

Для павышэння кваліфікацыі мастакоў у Мінску, Брэсце, Гродна, Баранавічах, Гомелі і Віцебску будуць працаваць вячэрнія студыі рысунка. Мастацтвазнаўцы прачытаюць цыкл лекцый па тэхналогіі жывапісу. Для абласных мастакоў у Мінску будзе праведзены творчы семінар.

Мастакі Совецкай Беларусі, сказаў у заключэнне А. Бембель, сустракаюць новы год, поўныя глыбокага жадання ўдасканаліць сваё майстэрства, пераадолець тыя хібы ў творчасці, якія выявіліся на апошняй рэспубліканскай выстаўцы.

У новым годзе — да новых поспехаў

★ ★ ★ ★

Чакаем творы аб героях сучаснасці

Значнымі дасягненнямі і поспехамі ва ўсіх галінах нашага жыцця адзначаны 1953 год. Гэты год увойдзе ў гісторыю нашай краіны як год новых знамянальных рашэнняў Комуністычнай партыі і Совецкага ўрада, якія раскрываюць з велізарнай сілай гуманізм совецкага ладу, яго штодзённыя клопаты аб чалавеку, аб добрабыце народа.

XIX з'езд Комуністычнай партыі ўказаў на неабходнасць узняць наша мастацтва на яшчэ большую прынцыповую вышыню, на неабходнасць ствараць глыбокаідэйныя, высокамастацкія па сваёй якасці, разнастайныя па жанру спектаклі і фільмы, творы жывапісу і музыкі, павесці рашучую непрымірымую барацьбу з шэрасцю і рамесніцтвам у мастацтве.

Мы, творчыя працаўнікі тэатра, павінны глыбока разумець і адчуваць, што культурныя і эстэтычныя патрабаванні нашых совецкіх людзей растуць, а гэта патрабуе ад нас новых творчых пошукаў, смеласці і яскравасці ў стварэнні мастацкіх вобразаў, новых фарбаў, новага, больш высокага майстэрства. І ўсё гэта павінна быць накіравана на адну мэту — на больш глыбокае, поўнакроўнае адлюстраванне вялікай праўды нашага жыцця, на паказ у мастацтве нашага совецкага чалавека.

Трэба прызнацца, што аб совецкім чалавеку, нашым сучасніку, аб велічы яго спраў і харастве яго душы, аб своеасаблівых і тыповых рысах яго характару, аб індывідуальных, канкрэтных, непаўторных праявах гэтага характару мы вельмі і вельмі многа гаварылі, пісалі, разважалі ў 1953 годзе, але вельмі і вельмі мала паказвалі гэта ўсё на сцэне.

Кожны з нас, актораў і рэжысёраў тэатра імя Янкі Купалы, нядрэнна папрацаваў у 1953 годзе. Былі творчыя ўдачы і радасці, былі цудоўныя незабыўныя сустрэчы з гледачамі Данбаса і Кіева, дзе мы адчувалі сапраўдную дружбу і любоў з боку украінскага народа да нас, прадстаўнікоў беларускага мастацтва.

Мае акторскія работы ў 1953 годзе — гэта палкоўнік Уладзімір Шатроў у спектаклі «Залп «Аўроры», Дзюрвіль у новым варыянце п'есы А. Макаёнка «На досвітку», генерал-губернатар Курлоў у «Шчасці паэта» В. Віткі, Пампеў у п'есе Н. Вірты «Нагібель Пампеева». Кожная з гэтых ролей узбагаціла мой творчы вопыт, для кожнага з гэтых вобразаў я шукаў новыя своеасаблівыя фарбы і прыёмы для раскрыцця іх унутранай сутнасці і характару.

Як рэжысёр, я ажыццявіў пастаноўку спектакля «Каварства і любоў» Шылера.

Вялікую творчую радасць я заўсёды адчуваю, калі іграю ролю Гарлахвацкага ў п'есе «Хто смяецца апошнім» К. Крапівы. Вось ужо амаль 300 разоў я яе выконваю і стараюся кожны раз знаходзіць нешта новае.

Але ўсё-ж я хачу сказаць, што для сапраўднай вялікай творчай радасці, творчага задавальнення мне нехапала ў 1953 годзе высокамастацкай і праўдзівай сучаснай п'есы, нехапала хвалюючага станоўчага вобраза нашага чалавека, аб увасабленні якога на сцэне я ўжо даўно мару.

Мы ўступаем у новы творчы працоўны год з вялікай верай, што будуць напісаны новыя смелыя і высокамастацкія п'есы. Мы ўступаем у новы год з вялікім жаданнем ствараць на сцэне новыя цікавыя і хвалюючыя спектаклі аб нашым жыцці, новыя станоўчыя вобразы нашых совецкіх людзей.

Л. РАХЛЕНКА,
народны артыст БССР.

Дапамагаць моладзі

Мы спадзяемся, што ў 1954 годзе з'явіцца многа добрых і разнастайных па жанрах п'ес з жывымі вобразамі людзей, з праўдзівымі, захапляючымі і страснымі канфліктамі. У рабоце нашага тэатра многа недахопаў і новы год мы аб'явілі для сябе годам барацьбы за якасць спектакляў, за ўзняцце агульнай і прафесійнай культуры ў рабоце ўсіх звенняў тэатра.

У першай палове 1954 года тэатр пакажа працоўным Гродна і вобласці спектаклі: «Госці» І. Горына, «Сын рыбака» — па раману В. Лаціса (інсцэніроўка Н. Гарчакова), «Простая дзяўчына» К. Губарэвіча, «Вогнены мост» Б. Рамашова, «Цяжкія дні» А. Астроўскага, «Валенсіанская ўдава» Лопе дэ Вега, «Яўгенія Грандэ» О. Бальзака.

Апрача таго, у студзені будуць выпушчаны дзве пераходныя з 1953 года новыя пастаноўкі: «Грэх ды бяда на каго не жыве» А. Астроўскага і «Марыя Цюдор» В. Гюго.

Да апошняга часу афармленне нашых спектакляў пакідала жадаць многа лепшага. Выпадковыя мастакі праходзілі праз наш тэатр, як праз прахадны двор, не пакідаючы ніякага творчага следу, не праяўляючы ніякага вынаходніцтва. Цяпер гэтую галіну работы ў тэатры ўзначальвае галоўны мастак — заслужаны дзеяч мастацтва БССР О. Марыкс, які валодае высокапрафесійнай культурай, глыбокімі ведамі і вялікім вопытам.

У канцы 1953 года ЦК комсамола Беларусі і Галоўнае ўпраўленне па справах мастацтва Міністэрства культуры БССР аб'явілі конкурс творчай моладзі ўстаноў мастацтва БССР, заканчэнне якога намечана ў маі 1954 года. Уся наша моладзь будзе ўдзельнічаць у гэтым конкурсе.

Цяпер уся рэпертуарна-пастановачная работа тэатра праводзіцца ў дапамогу гэтаму мерапрыемству. Вядучыя майстры нашага тэатра імкнуцца аказаць моладзі ўсебаковую практычную дапамогу.

Нас глыбока зацікавіў раман Піліпа Пестрака «Сустрэнемся на барыкадах». Наш тэатр працуе ў горадзе, дзе адбываліся некаторыя падзеі рамана, таму, улічваючы ідэйна-мастацкія якасці твора і яго надзённасць, мы задумалі інсцэніраваць яго.

У новым годзе калектыў тэатра будзе яшчэ шырэй абслугоўваць калгаснае сялянства, паказваць лепшыя сцэнічныя творы ў калгасах і саўгасах.

А. МІРОНСКІ,
галоўны рэжысёр Гродзенскага абласнога драматычнага тэатра, заслужаны дзеяч мастацтва Бурат-Мангольскай АССР.

Опера для дзяцей

Яшчэ два гады таму назад у нас з'явілася думка напісаць дзіцячую оперу. Доўга абдумваўся сюжэт, падрабязны план будучага твора.

... Дзея адбываецца ў невялікім беларускім гарадку ў час Вялікай Айчыннай вайны. Нам хацелася паказаць стойкіх, валявых юных патрыётаў, іх дапамогу партызанам.

У час сур'ёзных выпрабаванняў, у час барацьбы з фашысцкімі акупантамі праяўляецца рыса характару галоўнай гераіні оперы — Марынкі: адвага, рашучасць, кемлівасць. Разам з тым, Марынка — глыбока лірычная натура.

Дзецям уласціва яркая фантазія, любоў да казкі. Нам хацелася, каб фантастыка арганічна вынікала з рэальных абставін.

Лібрэта ў асноўным напісана, — ідзе канчатковая яго дапрацоўка.

Нас вельмі ўзрадавала тая вялікая ўвага, якую аддае грамадскасць стварэнню першай дзіцячай оперы ў рэспубліцы. Сустрэча з піонерважатымі, работнікамі рэдакцый дзіцячых газет, кампазітарамі і літаратарамі, работнікамі Міністэрства культуры БССР прынесла нам значную карысць.

Напісана музыка для пралога і эпілога. Ствараецца музыка другога акта (опера разлічана на тры акты).

Спадзяемся, што ў першай палове 1954 года работа над операй «Марынка» будзе закончана. А пасля мы з [illegible]кім хваляваннем будзем чакаць сустрэчы з нашымі галоўнымі крытыкамі — з гледачамі.

Эдзі АГНЯЦВЕТ,
паэтэса.
Рыгор ПУКСТ,
кампазітар.

Законныя спадзяванні

Калі артыст думае аб сваіх творчых перспектывах або падводзіць вынікі пэўнаму перыяду свайго творчага жыцця, ён перш за ўсё думае аб п'есах, аб тых ролях, якія ён сыграў. Драматургія для артыста — гэта паветра. Ёсць добрая п'еса, добрая роля — лёгка дыхаць, тварыць. І як радасна тварыць, калі раскрываеш на сцэне пачуцці, якія хвалююць глядзельную залу.

Глядач праяўляе павышаную цікавасць да праблем сённешняга дня. Ён хоча бачыць на сцэне вобразы сучаснікаў. На жаль, калі ў нешматлікіх добрых совецкіх п'есах аўтары выпісваюць мужчынскія вобразы, ствараюць характары сучаснікаў і нашы сабраты па прафесіі — акторы маюць магчымасць тварыць, дык нам, артысткам, такое шчасце выпадае вельмі рэдка.

Сістэматычна «не шанцуе» артысткам сярэдняга пакалення. У большасці п'ес, калі ёсць жаночыя вобразы — дык гэта ў асноўным моладзь. Як быццам жанчыны сярэдніх год не з'яўляюцца будаўнікамі нашага жыцця, стаяць у баку ад велічных спраў, якімі жыве наш совецкі народ. Многія драматургі неглыбока пранікаюць у жыццё, мала ведаюць аб працэсах, якія адбываюцца ў ім. За гэта, перш за ўсё, разлічваемся мы — артысткі сярэдняга пакалення. І разлічваемся вельмі дарагой цаной — цаной творчай бяздзейнасці.

За мінулы год я сыграла толькі дзве ролі нашых сучасніц: ролю Тэрэзы ў «Трэцяй маладосці» бр. Тур і ролю Ганны ў п'есе А. Макаёнка «Выбачайце, калі ласка!».

Роля Ганны прыносіць артыстцы радасць сваім пафасам сцверджання новага жыцця. Але яна не дае падстаў для вялікай творчай работы, дзе-б можна было не толькі раскрыць адну якую-небудзь рысу характару, але стварыць шматгранны вобраз.

Новая п'еса А. Сафронава «Сэрца не даруе», з якой калектыў пазнаёміўся і рэпетыцыі якой у бліжэйшы час пачнуцца, дае права думаць, што многія артысткі нарэшце атрымаюць магчымасць прыкласці свае творчыя сілы.

У плане нашага тэатра на новы год — «Гарачае сэрца» Астроўскага; да чэхаўскіх дзён будзе адноўлены спектакль «Тры сястры».

Усё гэта прадказвае добры творчы год.

Хочацца верыць, што беларускія драматургі зробяць усё, каб стварыць п'есы, якія глыбока адлюструюць нашу рэчаіснасць, і новы год прынясе мне і ўсім нашым артысткам цікавую творчую работу.

М. БЯЛІНСКАЯ,
народная артыстка БССР.

З ЗАМЕЖНАЙ ПОШТЫ

Сумныя перспектывы

АТАМНЫ ПСІХОЗ

Начальнік пасіўнай абароны (так называецца ў ЗША служба абароны мірнага насельніцтва ў час вайны) Ван Петэрсан выступіў па радыё з заявай аб тым, што надыйшоў час ствараць гарады... пад зямлёй. Ён сказаў, што «відавочна год праз дваццаць усе сучасныя гарады прыдзецца замяніць падземнымі».

У сувязі з гэтым Нью-Йоркскае таварыства архітэктараў прапануе «паставіць праблемы падземнага горада перад архітэктурнай думкай краіны і вывучыць магчымасці стварэння грандыёзных падземных збудаванняў». Таварыства арганізуе конкурс праектаў падземнага горада.

Вядомы архітэктар Спельман прытрымліваецца іншай думкі. Ён лічыць, што значная частка насельніцтва сучасных амерыканскіх гарадоў зможа добра жыць «у шматлікіх пячорах ля берагоў рэк на далёкім захадзе». Спельман заклікае архітэктараў заняцца вывучэннем «пячораў для практычнага іх прымянення».

Атамны псіхоз захапіў многіх амерыканскіх дзеячоў. Старшыня нацыянальнай камісіі па атамнай энергіі Гардан Даун у сваім выступленні ў Лос-Анджэлосе сцвярджаў, што «вораг з'явіцца праз Арктыку» і таму «нельга быць міралюбцам, трэба аб'яднаць усю энергію і сілу».

Не падабаецца мір любіцелям атамнай панікі. Пасля заключэння перамір'я ў Карэі амерыканскія манапалісты адчулі сябе няёмка. Нездарма адзін з артыкулаў часопіса «Нью-Вік» быў названы «Жахі міру». У артыкуле рабіліся падлікі, якія жахі церпіць амерыканская прамысловасць, гандаль. Мір дрэнна ўплывае на амерыканскіх бізнесменаў.

Ваенны аглядальнік газеты «Нью-Йорк Таймс» Гансан Балдуін, як відаць, таксама нядрэнны камерсант. Ён піша аб тым, што атамныя бомбы тыпу А і Н валодаюць вялікай разбуральнай сілай. Але сіла вадародных бомб яшчэ больш значная. Яны могуць, напрыклад, ператварыць усю даліну Рэйна ў пустыню. Далей гэты журналіст-камерсант сцвярджае, што на ўтрыманне рэгулярнай арміі выдаткуецца многа сродкаў. Лепш кінуць бомбу, гэта — эфектна і танна!

Каментарыі, як кажуць, не патрэбны.

«УСЕ НЕМЦЫ ПАВІННЫ СТАЦЬ ВОІНАМІ»

«Нямецкая салдацкая газета», якая выходзіць у горадзе Эсене, на ўсе лады захвальвае перавагі ваенных перад грамадзянскімі асобамі.

«У 1954 годзе, — піша газета, — усе маладыя немцы павінны стаць воінамі. Гэта — лепшае прызначэнне чалавека!» Газета паведамляе аб тым, што для новай германскай арміі патрэбны будуць інтэрафіцэры і афіцэры. Гэта, на думку газеты, самая лёгкая праца.

Цікавасць прадстаўляюць наступныя разважанні газеты: «Раней лічылася, што для афіцэра патрэбна сярэдняя адукацыя. Старое, аджыўшае ўяўленне. Для афіцэраў еўрапейскай арміі нашых дзён інтэлектуальнае развіццё не абавязковае...»

ПРАГНОЗЫ АНГЛІЙСКАГА ЭКАНАМІСТА

Вядомы англійскі буржуазны эканамі[illegible] Колін Кларк у газеце «Манчэстэр г[illegible]дынг» прысвяціў серыю артыкулаў эка[illegible]мічным перспектывам новага года [illegible] прыходзіць да песімістычных вывадаў.

Кларк лічыць, што ў сярэдзіне 1[illegible] года пачнецца цяжкі эканамічны крызіс, які «парушыць усе звенні амерыканскай эканомікі, а таксама ўдарыць па [illegible] краінах, што звязаны з даларам». Эканаміст Кларк лічыць, што беспрацоўе ў [illegible] яшчэ больш павялічыцца.

Паводле слоў англійскага эканаміста, цэны ва ўсіх капіталістычных краінах [illegible]дуць расці. У Амерыцы яны павялічыліся ў параўнанні з цэнамі 1943 года [illegible] рэднім на 70 працэнтаў, а ў [illegible]ваных краінах Еўропы — ад 30 да [illegible] працэнтаў.

РАЗВАЖАННІ ЦЕМРАШАЛА

Англійскі філосаф Бертран Расел [illegible] мы сваімі вельмі рэакцыйнымі погля[illegible]. У кнізе «Перспэктыва каштоўнасцей [illegible] атамны век» ён адстойвае думку аб [illegible] што трэба імкнуцца да адзінай дзяржавы [illegible] улады на чале са Злучанымі Штатамі Амерыкі.

Выказнік інтарэсаў амерыканскага [illegible] перыялізма Бертран Расел вельмі зан[illegible]коены лёсам здрадніка карэйскага на[illegible] Лі Сын Мана. На старонках лейбарыс[illegible] газеты «Дэйлі-Геральд» рэакцыйны ф[illegible]саф прапануе Арганізацыі Аб'яднаных [illegible]цый «узняцца без страху на абарону» [illegible]цярпеўшай марыянеткі. «Я хацеў-бы, [illegible] пісаў Бертран Расел, — каб у Вялікабрытаніі арганізавалі ў 1954 годзе рэфе[illegible]дум па пытанню: ці жадаеце вы пам[illegible] за Лі Сын Мана?»

Нават калі-б гэты рэферэндум і быў [illegible]ганізаваны, яго вынікі не былі-б у карысці «філосафа». Ні прагрэсіўна настро[illegible] людзей Англіі, ні сярэдняга абываталя [illegible] можа радаваць перспектыва памер[illegible] крывавага ката карэйскага народа, [illegible]га паслугача амерыканскіх імперыялістаў Лі Сын Мана. Простыя людзі Англіі [illegible]чуць міру і змагаюцца супраць небяспекі новай вайны.

«ЧЫРВОНАЯ ШАПАЧКА» І МАКАРТЫСЦКАЯ ВАЎЧЫХА

Бедная «Чырвоная шапачка»! [illegible] табе пагражаюць ворагі яшчэ больш спечныя, чым казачны воўк. Цяжк[illegible] жывецца ў сучаснай Амерыцы. Цяпе[illegible] «страшным комуністычным эстэтатара[illegible]».

Да такіх вывадаў прыйшла пейка[illegible] Вайт — дэлегат камісіі па школьны[illegible] кетах у штаце Індыяна. Гэта яна з[illegible] ў вядомай папулярнай казцы «[illegible] прапаганду комунізма». Абура[illegible] Вайт загадала выкінуць «Чыр[illegible] пачку» са школьных бібліятэк.

Мастацка-спартыўны сезон

Сяброўскі шарж мастака **А. Волкава.**

Многалюдна сёння на навагоднім катку: мастацка-спартыўны сезон у поўным разгары. З прычыны абмежаванасці газетнай плошчы мастаку не ўдалося намаляваць усіх спартсменаў літаратуры, жывапісу, музыкі і тэатральнага мастацтва. Няхай не крыўдзяцца на нас тыя, хто не паказаны ў гэтых сяброўскіх шаржах, — сустракаем не апошні Новы год.

Вось заняты стварэннем новай скульптуры Заір Азгур. І хоць снегу цяпер вельмі многа, з якога Азгур на гэты раз лепіць Дзеда Мароза, а ўсё-ж ён эканоміць матэрыял, робіць толькі бюст Дзеда. Можна не сумняваццa, што скульптура Дзеда Мароза атрымаецца з поўным падабенствам на арыгінал, парукай гэтаму—фотаздымак Дзеда, які трымае Азгур у правай руцэ... Скульптар і на гэты раз застаецца верным сабе— заняты працай з краю катка, таксама, як ён знаходзіцца з краю жыцця Саюза мастакоў.

Павел Каналенў, як ні дзіўна, знаходзіцца не за сваім сталом адказнага сакратара праўлення Саюза пісьменнікаў БССР. Выехаў ён на каток з каляскай марожанічыка, каб «выращаць пытанні гаспадарчых адносін да літаратуры». Марожанае ў яго новага гатунку — РКУ (рад каштоўных указанняў).

Пятро Глебка і Кандрат Крапіва катаюцца ў самым цэнтры поля. Адна пара канькоў і адзін руска-беларускі слоўнік на двух, які яны не могуць выпусціць ужо на працягу многіх год.

Андрэй Бембель невыпадкова намаляваны ў пяці асобах. Спяваючы песеньку «А я сам, а я сам, я не веру мастакам», ён адзін вырашае ўсе пытанні работы Саюза мастакоў і адначасова сам з сабой гуляе навыперадкі на мастацкім полі.

Непадалёку, як бачыце, на раме нацягнута палатно. Гэта колькі год намерваецца напісаць карціну Іван Ахрэмчык. Над будучай карцінай варона ўправілася нацягаць сабе гняздо.

Канстанцін Саннікаў і Леанід Рахленка прышлі на каток, апранутыя не па сезону, у купальных касцюмах. Ім прапануюць канькі, а яны ад іх катэгарычна адмаўляюцца, сцвярджаючы, што яны ўмеюць толькі плаваць у выткіраўніцтва тэатрам (тэатр імя Янкі Купалы амат[illegible] працуе без мастацкага кіраўні[illegible]

У Саюзе пісьменнікаў гоман[illegible]русь Броўка хоча затрымаць ад[illegible]тара, які ўцякае ў «Масквічу». І [illegible]шыся да своеасаблівага нумар[illegible]ны — «Аўта-рытэт», не цяж[illegible]дацца, хто такі ўцякач. Гэта Мі[illegible]ны, які «выпадкова» прыхапіў [illegible]шэню апавяданне Барыса Ла[illegible]рытэт».

Замерзла «Князь-возера» [illegible]гы і балета). Тым часам Аля[illegible]лаеў выпісвае на каньках «Апо[illegible]ханні».

Глядзіш на Івана Шамякі[illegible] пакадуеш яго — да таго ця[illegible]цягнуць свой воз! Не заўваж[illegible]дзімір Карпаў прымасціўся [illegible] і строчыць хвалебныя рэцэ[illegible]аўтара.

Яўгеній Цікоцкі і Пётр Падкава[illegible] выпадкова аказаліся са сваім пянін[illegible] адкрытым небам — Саюз кампазітараў [illegible]не атрымае сабе памяшкання. Крушць [illegible]ты калаўрот Мінскі горсавет.

Мастацка-спартыўны сезон у [illegible]гары, ёсць дзе пакатацца, ёсць [illegible]сіць, асабліва асобным крыты[illegible] спецыяльным ларку, каб, па[illegible] іншы раз чорнае назваць бел[illegible]рот. Што-ж датычыць некаце[illegible] дык да іх паслуг — ларок зака[illegible] рыфмаў. Звойдуць сабе неабхо[illegible] і празаікі і музыкан[illegible]

З Новым годам, дарагія сяб[illegible]

Галоўны рэдактар Васіль [illegible]
Рэдакцыйная калегія: Заір А[illegible]рый АРЛОЎ, Уладзімір АЛОУН[illegible] БАЧЫЛА (намеснік галоўнага [illegible] Васіль БУРНОСАЎ, Кастусь [illegible] Ірына ЖДАНОВІЧ, Павел КАГ[illegible] ПЯРКОЎСКІ.

АДРАС РЭДАКЦЫІ: г. Мінск, Совецкая, 34. Тэлефоны: галоўнага рэдактара і намесніка галоўнага рэдактара 2-31-94, адказнага сакратара 2-32-04, аддзелаў літаратуры, мас[illegible]ва і публіцыстыкі 2-14-94, выдавецтва і [illegible]

АТ 02101. Друкарня «Чырвоны друкар», Мінск, Рэволюцыйная, 12.